# ВОДЗЫЎ

аб аўтарэфераце дысертацыі
Мусіенкі Васіля Анатольевіча
"СЕМАНТЫЧНАЯ ДЭРЫВАЦЫЯ Ў СФЕРЫ МЕНТАЛЬНЫХ НАМІНАЦЫЙ:
НА МАТЭРЫЯЛЕ БЕЛАРУСКАЙ І АНГЛІЙСКАЙ МОЎ",
прадстаўленай на саісканне вучонай ступені
кандыдата філалагічных навук
па спецыяльнасці 10.02.20 – параўнальна-гістарычнае, тыпалагічнае і
супастаўляльнае мовазнаўства

Тэма, абраная даследчыкам для распрацоўкі, безумоўна запатрабаваная часам – па-першае, самой сучаснай сацыякультурнай сітуацыяй, якая характарызуецца такімі рысамі, як інтэнсіфікацыя міжэтнічных і міждзяржаўных кантактаў, уплыў наступстваў глабалізацыі ў розных сферах чалавечай жыццядзейнасці і г.д. Акрамя таго, непасрэдны аб'ект назірання – ментальная сфера чалавека, прадстаўленая скрозь прызму семантычнай дэрывацыі, – таксама варты ўвагі з прычыны неабходнасці далейшага, больш глыбокага спасціжэння ментальных феноменаў, пэўную інфармацыю аб якіх нясе мова ў цэлым. Таму рэпрэзентацыі ментальнай сферы чалавека прасродкам другасных намінацый, уласцівых для дзвюх моў – беларускай і англійскай – тэма, безумоўна актуальная, вынікі распрацоўкі якой зацікавяць не толькі лінгвістаў-лексіколагаў, але і шэраг спецыялістаў іншых мовазнаўчых дысцыплін і нават прадстаўнікоў іншых навуковых напрамкаў.

Дысертант упершыню вырашае задачу ўстанаўлення спецыфікі семантычнай рэпрэзентацыі другасных ментальных намінацый у беларускай і англійскай мовах.

Новымі для сучаснай лінгвістычнай навукі з'яўляюцца распрацаваная даследчыкам метадалогія класіфікацыі другасных намінацый, у аснову якой пакладзены характар суаднесенасці зыходнага і рэцыпіентнага ЛСВ і агульная накіраванасць семантычнай дэрывацыі; устаноўленыя мадэлі ўтварэння другасных ЛСВ на аснове выкарыстання зыходных ЛСВ субстантыўных, ад'ектыўных і дзеяслоўных намінацый; выяўленыя тыпалагічныя і спецыфічныя мадэлі семантычнай дэрывацыі; устаноўленыя тыпы міжмоўных карэляцый з адносінамі семантычнага супадзення, частковай ці поўнай эквівалентнасці і безэквівалентнасці.

Асаблівай увагі, на наш погляд, заслугоўвае ўпершыню створаны ў беларускай і англійскай лексікаграфічнай практыцы на аснове значнага па аб'ёме рэпрэзентатыўнага фактычнага матэрыялу «Беларуска-англійскі тлумачальны слоўнік другасных ментальных намінацый», што сведчыць таксама аб практычнай і сацыяльна-эканамічнай значнасці даследавання.

Як сведчыць аўтарэферат, дысертацыя прайшла належную апрабацыю, яе вынікі ў дастатковай меры адлюставаны ў навуковым друку ў адпаведнасці з існуючымі патрабаваннямі ВАК Беларусі.

Лічу, што ў адпаведнасці з патрабаваннямі пунктаў 18, 19, 20 Палажэння аб прысуджэнні навуковых ступеняў і прысваенні навуковых званняў навуковая ступень кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці "10.02.20 –

параўнальна-гістарычнае, тыпалагічнае і супастаўляльнае мовазнаўства" можа быць прысуджана Васілю Анатольевічу Мусіенку за:

- выяўленне і сістэматызацыю найбольш поўнага корпуса другасных ментальных лексіка-семантычных варыянтаў у іменных і дзеяслоўных намінацыях беларускай і англійскай моў і стварэнне на гэтай аснове «Беларуска-англійскага тлумачальнага слоўніка другасных ментальных намінацый»;

- устанаўленне спецыфікі семантычнай дэрывацыі ў розных лексіка-граматычных разрадах слоў і выяўленне асноўных ментальных мадэляў у субстантывах беларускай і англійскай моў;

- рспрацоўку семантычнай класіфікацыі ментальных ад'ектываў у адпаведнасці з характарам суаднесенасці зыходнага і вытворнага лексіка-семантычных варыянтаў і ступені прадстаўленасці тых ці іншых квалітатыўных груп і аб'яднанняў у зыходнай паняційнай сферы;

- устанаўленне асноўных заканамернасцяў і напрамкаў сэнсавага развіцця дзеясловаў мыслення, пазнання, памяці, разумення і ўяўлення, а таксама спецыфікі сінтаксічнай спалучальнасці дзеяслоўных адзінак з субстантывам *думка*;

- выяўленне тыпалагічнага падабенства і нацыянальна-культурных адрозненняў рэпрэзентацыі другасных ментальных намінацый у беларускай і англійскай мовах, вызначэнне асноўных тыпаў семантычнай эквівалентнасці беларускіх і англійскіх ментальных лексічных адзінак.

Дацэнт кафедры беларускай
і рускай філалогіі
УА МДПУ імя І.П.Шамякіна,
кандыдат філалагічных навук,
дацэнт
20.09.2022 С.Б. Кураш

АДДЗЕЛ КАДРАЎ

Кураш С. Б.
Личную подпись ______
заверяю
Инспектор ОК ______
20 " 09 ______ 2022 г.